ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК “ Навагрудская
раённая бібліятэка”
______________І.М.Царук
“______” ____________2017 г




**Навагрудак, 2017**

## 1. Агульныя палажэнні

1.1 Конкурс "Мая гісторыя беларускай кнігі" (далей - Конкурс) праводзіцца з нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.
1.2. Арганізатарам Конкурса з’яўляецца ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка”.
1.3. Конкурс пройдзе ва ўсіх структурных падраздяленнях ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка”.
1.4. Гэтае Палажэнне вызначае мэты, задачы і ход правядзення конкурсу.

## 2. Мэты і задачы

2.1. Мэта
2.1.1. Павышэнне прэстыжу беларускай кнігі і чытання
2.2. Задачы
2.2.1. Развіццё цікавасці да беларускай гісторыі і культуры.
2.2.2. Вывучэнне гісторыі Беларусі праз гісторыю кнігі.
2.2.3. Выхаванне патрыётаў сваёй краіны.
2.2.4. Стымуляванне чытацкай і творчай актыўнасці
2.2.5. Садзейнічанне фарміраванню літаратурнага густу, станоўчых адносін да беларускай кнігі.
2.2.6. Зацвярджэнне аўтарытэту кнігі і чытання ў сучасным грамадстве.
2.2.7. Садзейнічанне павышэнню іміджу бібліятэкі і папулярызацыя яе рэсурсаў.

## 3. Тэрміны правядзення

3.1. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 1 лютага па 31 ліпеня 2017 года.
3.2. Падвядзенне вынікаў з 1 па 31 жніўня 2017 года.

## 4. Удзельнікі

4.1 У Конкурсе прымаюць удзел чытачы бібліятэк ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка” незалежна ад узросту.
4.2. Калектыўныя работы да разгляду не прымаюцца.

## 5. Парадак і ўмовы правядзення

5.1. Ацэньваецца адна творчая работа ўдзельніка, якая павінна быць напісана на беларускай мове.
5.2. Работа можа быць прадстаўлена ў выглядзе:

- празаічнага твора (аповесці, апаведа і інш.)
- паэзіі (байкі, оды, гумарэскі і інш.)
- рэцэнзіі
- сачынення
- твора ў публіцыстычным стылі
- электроннай прэзентацыі
- буктрэйлера
- малюнка або серыі малюнкаў.

5.3. Работа суправаджаецца тытульным лістом, на якім указаны: прозвішча, імя, імя па бацьку выканаўцы; назву работы; месца і тэрмін выканання.

5.4. Аб’ём працы павінен мець наступныя памеры:

- *проза (аповесць, апавед), сачыненне* – неабмежавана
- *паэзія (байка, ода, гумарэска)* – не менш за 12 радкоў
- *рэцэнзія* – не больш за адну старонку
- *твор публіцыстычнага стылю* (выкарыстоўваецца ў жанрах: артыкул у газету, нарыс, рэпартаж, фельетон, памфлет) не менш за 2 старонкі;
- *буктрэйлер* (які мае арыгінальны сюжэт) аптымальна – 3 хвіліны;
- *электронная прэзентацыя* – аптымальна – 15 слайдаў.

5.5. Конкурсныя работы падаюцца ў публічную бібліятэку па месцы жыхарства або ў аддзел бібліятэчнага маркетынгу Навагрудскай раённай бібліятэкі на адрас: горад Навагрудак, вул. 1 Мая, дом 1, 2-гі паверх, кабінет №9.

## 6. Падвядзенне вынікаў

6.1. Пераможцамі Конкурса будуць лічыцца чытачы, якіх адбярэ і назаве Журы.
6.2. Будзе ўлічвацца:
- змест і арыгінальнасць выкананага задання
- выкананне тэрмінаў прадстаўлення матэрыялаў па патрабаваннях Конкурса
- акуратнасць і крэатыўнасць у афармленні прадстаўляемых матэрыялаў.

6.3. Узнагароджванне пераможцаў адбудзецца 15 верасня 2017 года падчас святкавання Дня бібліятэк.
6.4. Пераможцам конкурса па кожным жанры будуць уручаны Дыпломы 1-й, 2-й і 3-й ступені.
6.5. Пры адсутнасці годных работ у пэўных жанрах Журы мае права не вызначаць пераможцаў.
6.6. Лепшыя работы і інфармацыя аб пераможцах будуць размешчаны на сайце ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка” http://novcrb.grodno.by

**Склад журы :**

Старшыня:
1. Старадымава І.В., намеснік дырэктара ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка”

Члены:
2. Шаўчук І.А., загадчык адзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка”
3. Малюжэнец Ф.А., загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу
4. Івашкевіч С.І., галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу
5. Жых В.К., метадыст І катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу.
6. Янушкевіч А.В., бібліятэкар ІІ катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу